мавання аб крыніцах другаснай інфармацыі і стварыла фактаграфічныя і бібліяграфічныя базы дадзеных аб бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных цэнтрах, аб усіх крыніцах другаснай інфармацыі (даведачных і інфармацыйных выданнях, якія выходзяць у рэспубліцы і па-за яе межамі, каталогах і картатэках, банках і базах дадзеных). На гэтай базе бібліятэка магла б рыхтаваць бібліяграфічныя работы рознага прызначэння.

Неабходна стварэнне рэтраспектыунага паказальніка, які б адлюстроувау бібліяграфічныя дапаможнікі змястоуна і па аутарскай прыкмеце звязаныя з Беларуссю і выданыя да 1917 г. незалежна ад мовы; прадоужыць улік у рэтраспектыуных паказальніках бібліяграфічных дакументау, якія выйшлі пасля 1973 г.

Адной з важных праблем з'яуляецца павышэнне аператыунасці падрыхтоукі і выпуску бягучага штогодніка "Паказальнік бібліяграфічных даведнікау Беларусі", які сення выходзіць са значным спазненнем.

Патрэбна удасканаленне інфармацыі аб неапублікаваных бібліяграфічных дапаможніках: фарміраванне рэспубліканскага фонду гэтых дакументау, павышэнне паунаты адлюстравання бібліяграфічных спісау, пашырэнне аб'ектау бібліяграфавання, актывізацыя іх выкарыстання.

Актуальнай таксама з'яуляецца праблема стварэння зводных каталогау аб даведачна-бібліяграфічных фонда бібліятэк; стварэнне даведнікау па бібліяграфічных рэсурсах у дапамогу спецыялістам, навуковым супрацоунікам.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ У 1919-1929 гг.

Т.А.Сазонава (аспірантка)

Цікавасць да гісторыі, далекай і блізкай, складае найбольш характэрную і устойлівую прыкмету духоунага жыцця Беларусі у апошнія часы. Гэты "дыялог з мінулым" тлумачыцца прагай самапазнання культуры, якая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяу была рэзка абмежавана. У 1919-1929 гады пытанне арганізацыі бібліяграфіі у нацыянальных рэспубліках з'уляялася адным з най



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш важных. Звязана гэта перш за усе з тым, што ў 1905-1917 гады на Беларусі, у так званы "перыяд адраджэння" ставіцца задача выдання кнігі на нацыянальнай мове, пашыраецца тэматыка і кола чытачоў беларускай кнігі.

Усе гэта высоўвала патрабаванні адмовы ад старых метадаў уліку і вывучэння кніжнай прадукцыі. Неабходна было ажыццявіць такую рэгістрацыю беларускай нацыянальнай кніжнай прадукцыі, якая б не парушала функцыянальную сувязь кнігі з грамадствам і не змешвала б яе са шматтысячнай плынню рускай кнігі.

Перад беларускай бібліяграфіяй з усёй вастрынёй паўстала пытанне аб арганізацыйных асновах яе работы. У сувязі з гэтым, на наш погляд, вельмі мэтазгодны разгляд тых тэарэтычных абгрунтаванняў і розных пунктаў гледжання на арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці, якія з'явіліся прадметам абмеркавання першых двух Усерасійскіх бібліяграфічных з'ездаў.

Асноўная заслуга ў распрацоўцы арганізацыйных пытанняў бібліяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь належыць Дзяржаўнай бібліятэцы і былому яе дырэктару І.Б.Сіманоўскаму. У сваіх працах, а таксама ў выступленнях на бібліяграфічных з'ездах і нарадах ён разглядаў найбольш актуальныя праблемы бібліяграфіі, ставіў на перш план пытанні арганізацыі бібліяграфічнай работы, яе каардынацыі і кааперацыі.

У арганізацыі беларускай бібліяграфіі ў 1919-1929 гг. намі выдзелены два перыяды. Пачатак першага арганізацыйнага перыяду беларускай бібліяграфіі звязаны з утварэннем у студзені 1919 года пры Наркамправе Беларусі аддзела па пазашкольнай адукацыі, пазней ён быў названы бібліятэчным пададдзелам, які ажыццяўляў у тыя гады кіраўніцтва развіццём сеткі бібліятэк, іх фінансаванне і забеспячэнне літаратурай, аказваў бібліятэкам метадычную дапамогу. Правядзенне гэтых мерапрыемстваў дазволіла стварыць базу для арганізацыі беларускай бібліятэчнай бібліяграфіі. Важнай умовай развіцця бібліяграфіі з'явілася стварэнне ў снежні 1920 г. Беларускага аддзялення Дзяржвыда РСФСР (з 1921 г. Дзяржвыд БССР). Адначасова ў шэрагу гарадоў Беларусі - Бабруйску, Барысаве, Слуцку, Мазыры і інш. сталі функцыяніраваць аддзяленні Дзяржвыда. Усе гэта з'явілася пачаткам сістэматычнай выдавецкай дзейнасці ў рэспубліцы і запатрабавала

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

ад бібліяграфіі рэгулярнага бібліяграфічнага інфармавання аб друкаваных выданнях.

Межы наступнага перыяду вызначаюцца пастановай Саўнаркома рэспублікі Беларусь ад 15.09.22 г. "Аб заснаванні Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі і абавязковай рэгістрацыі ўсіх друкаваных выданняў", якая паслужыла пачаткам арганізацыйнага афармлення агульнай бібліяграфіі. Для развіцця беларускай навукова-дапаможнай бібліяграфіі вялікае значэнне мела ўтварэнне ў 1929г. пры Савеце народных камісараў Беларусі вышэйшай дзяржаўнай і навукова-даследчай установы рэспублікі – Інстытута беларускай культуры. Для ўпарадкавання і вядзення бібліяграфічнай дзейнасці 21 красавіка 1925 г. пры Інбелкульце была створана бібліяграфічная камісія. Цэнтрам рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў 20-я гг. стаў палітыка-асветніцкі аддзел Наркамасвета Беларусі, у прыватнасці, яго клубна-бібліятэчны аддзел. Завяршаецца гэты перыяд 1929 годам, калі адбываецца паступовае скарачэнне грамадскіх арганізацый, якія прымалі актыўны ўдзел у бібліяграфічнай дзейнасці рэспублікі. Пад лозунгам барацьбы з нацыяналізмам дэмакратычныя традыцыі беларускай бібліяграфіі былі прыпынены і дэфармаваны. З пачатку 30-х гадоў бібліяграфічнай дзейнасцю займаюцца толькі дзяржаўныя арганізацыі і яна поўнасцю падмяняецца ідэалагічнымі ўстаноўкамі, якія панавалі ў перыяд культу асобы І.В.Сталіна.

## БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНЫ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР У ВЫХАВАННІ БУДУЧЫХ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ ДЗІЦЯЧЫХ ХАРАВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

У.Д.Каструлеў

Беларускі народ стварыў сваю адметную культуру, важнае месца сярод якой належыць народнай творчасці.

Ужо ў першыя гады жыцця чалавека, фарміруюцца тыя пачуцці, рысы характару, якія звязваюць яго са сваім народам, сваёй краінай. Родная мова, якую засвойвае дзіця, знаёмячыся з народнымі песнямі, музыкай, казкамі, гульнямі, з'яўляецца тым падмуркам, на якім вырастае потым пачуццё Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ